УДК 94(476):929.7«15/16»

# ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫЕ ПУТЕШЕСТВИЯ ЛЬВА САПЕГИ И ЕГО СЫНОВЕЙ В УНИВЕРСИТЕТЫ ГЕРМАНИИ, НИДЕРЛАНДОВ И ИТАЛИИ В 1570–1630 гг.

*А. И. КОЛТАЧЕНКО*[1)]

[1)]*Республиканский институт высшей школы, ул. Московская, 15, 220007, г. Минск, Беларусь*

Рассмотрены особенности образовательных путешествий магнатов Великого княжества Литовского в университеты Западной Европы во второй половине XVI – первой половине XVII в. на примере семьи Сапегов, в частности Льва Сапеги, Яна Станислава Сапеги, Криштофа Николая Сапеги и Казимира Льва Сапеги. Раскрываются особенности их образовательных путешествий, а также влияние пройденного обучения на дальнейшую деятельность представителей рода. Отмечается, что традиция образовательных путешествий в европейские университеты началась со Льва Сапеги, об образовании которого известно немного из-за отсутствия семейных архивов второй половины XVI в. Однако многочисленные эпистолографические источники позволяют с точностью реконструировать образовательные путешествия его сыновей. Старший сын Льва Сапеги, Ян Станислав, учился в Вильне, Браунсберге, Вюрцбурге, Париже, Падуе, путешествовал по Священной Римской империи и Италии. Он изучал право, риторику, языки, совершенствовал искусство публичных выступлений. Младшие сыновья Льва Сапеги, Криштоф Николай и Казимир Лев, начали свое образование в Виленской иезуитской академии, а затем посетили Мюнхен, Ингольштадт, Лёвен, Болонью и Падую. Кроме того, они много времени проводили в поездках по Испанским Нидерландам, где посещали военные лагеря, наблюдали за ходом Тридцатилетней войны, встречались с испанскими аристократами и военачальниками. Для реконструкции указанных

**Образец цитирования:**
Калтачэнка АІ. Адукацыйныя падарожжы Льва Сапегі і яго сыноў ва ўніверсітэты Германіі, Нідэрландаў і Італіі ў 1570–1630 гг. *Журнал Белорусского государственного университета. История.* 2023;3:5–14.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2023-3-5-14
EDN: FEOLEO

**For citation:**
Kaltachenka AI. Educational travels of Lew Sapieha and his sons to the universities of Germany, the Netherlands and Italy in 1570–1630. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2023;3:5–14. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2023-3-5–14
EDN: FEOLEO

**Автор:**
***Алина Игоревна Колтаченко*** – аспирант кафедры историко-культурного наследия Беларуси факультета повышения квалификации и переподготовки. Научный руководитель – кандидат исторических наук, доцент А. В. Любый.

**Author:**
***Alina I. Kaltachenka***, graduate student at the department of historical and cultural heritage of Belarus, faculty of advanced training and retraining.
*koltachenkoalina@gmail.com*
*https://orcid.org/0000-0001-8188-8184*

CC BY NC

путешествий были использованы письма молодых Сапегов к отцу, Лаврентию Космовскому (гувернер Яна Станислава), братьев друг к другу и другая корреспонденция. Это позволило не только составить подробный маршрут каждого из сыновей Льва Сапеги, но и проследить логику, недостатки и преимущества этих поездок. Кроме того, письма дали возможность узнать о болезнях Яна Станислава и Криштофа Николая, а также о серьезных затруднениях в коммуникации между Западной Европой и Великим княжеством Литовским в первой половине XVII в. и путях решения этого вопроса.

***Ключевые слова:*** образовательное путешествие; Сапеги; Лев Сапега; Ян Станислав Сапега; Криштоф Николай Сапега; Казимир Лев Сапега; европейские университеты; переписка; раннее Новое время.

# АДУКАЦЫЙНЫЯ ПАДАРОЖЖЫ ЛЬВА САПЕГІ І ЯГО СЫНОЎ ВА ЎНІВЕРСІТЭТЫ ГЕРМАНІІ, НІДЭРЛАНДАЎ І ІТАЛІІ Ў 1570–1630 гг.

***А. І. КАЛТАЧЭНКА***[1*]

[1*]*Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, вул. Маскоўская, 15, 220007, г. Мінск, Беларусь*

Разгледжваюцца асаблівасці адукацыйных падарожжаў магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. на прыкладзе сям'і Сапегаў, у прыватнасці Льва Сапегі, Яна Станіслава Сапегі, Крыштофа Мікалая Сапегі і Казіміра Льва Сапегі. Раскрываюцца асаблівасці іх адукацыйных падарожжаў, а таксама ўплыў атрыманага навучання на будучую дзейнасць прадстаўнікоў роду. Адзначаецца, што традыцыя падарожжаў у еўрапейскія ўніверсітэты пачалася з Льва Сапегі, пра адукацыю якога вядома няшмат з-за адсутнасці архіваў роду ў другой палове XVI ст. Аднак шматлікія эпісталаграфічныя крыніцы дазваляюць з вялікай дакладнасцю рэканструяваць адукацыйныя падарожжы яго сыноў. Старэйшы сын Льва Сапегі, Ян Станіслаў, вучыўся ў Вільні, Браўнсбергу, Вюрцбургу, Парыжы, Падуі, здзейсніў падарожжа па Свяшчэннай Рымскай імперыі і Італіі. Ён займаўся вывучэннем права, рыторыкі, мовы, удасканальваў мастацтва публічных прамоў. Малодшыя сыны Льва Сапегі, Крыштоф Мікалай і Казімір Леў, пачалі сваю адукацыю ў Віленскай езуіцкай акадэміі, а затым наведалі Мюнхен, Інгальштат, Лёвен, Балонню і Падую. Акрамя таго, яны шмат часу правялі ў падарожжах па Іспанскіх Нідэрландах, дзе наведвалі ваенныя лагеры, назіралі за ходам Трыццацігадовай вайны і сустракаліся з іспанскімі арыстакратамі і военачальнікамі. Для рэканструкцыі падарожжаў былі выкарыстаны лісты маладых Сапегаў да бацькі, Лаўрэнція Касмоўскага (гувернёр Яна Станіслава), братоў адзін да аднаго і іншая карэспандэнцыя. Гэта дазволіла не толькі скласці падрабязны маршрут кожнага з сыноў Льва Сапегі, але і прасачыць логіку, хібы і перавагі кожнага падарожжа. Акрамя таго, гэта дало магчымасць даведацца пра хваробы Яна Станіслава і Крыштофа Мікалая, а таксама пра вялікія цяжкасці ў камунікацыі паміж Заходняй Еўропай і Вялікім Княствам Літоўскім у першай палове XVII ст. і шляхі вырашэння гэтага пытання.

***Ключавыя словы:*** адукацыйнае падарожжа; род Сапегаў; Леў Сапега; Ян Станіслаў Сапега; Крыштоф Мікалай Сапега; Казімір Леў Сапега; еўрапейскія ўніверсітэты; карэспандэнцыя; ранні Новы час.

# EDUCATIONAL TRAVELS OF LEW SAPIEHA AND HIS SONS TO THE UNIVERSITIES OF GERMANY, THE NETHERLANDS AND ITALY IN 1570–1630

***A. I. KALTACHENKA***[a]

[a]*National Institute of Higher Education, 15 Maskowskaja Street, Minsk 220007, Belarus*

The article considers the features of educational travels of magnates of the Grand Duchy of Lithuania to universities of Western Europe in the second half of the XVI – first half of the XVII century on the example of educational travels of Lew Sapieha, Jan Stanislav Sapieha, Krystof Mikalai Sapieha, Kazimir Lew Sapieha. The special attention is given to the features of their educational travels and their impact on further activities. A stable tradition of traveling of the representatives of the Sapieha family to European universities began with Lew Sapieha. The information about his education is very scant due to the lack of family archives of the second half of the XVI century. However, numerous epistolographic sources from the educational travels of his sons Jan Stanislav, Krystof Mikalai and Kazimir Lew Sapieh allow us to reconstruct their travels with great accuracy. The eldest son, Jan Stanislav, studied in Vilna, Braunsberg, Würzburg, Paris, Padua, traveled to the Holy Roman Empire and Italy, studied law, rhetoric, perfected the art of public speaking, studied languages. Krystof Mikalai and Kazimir Lew began their education at the Vilna Jesuit Academy, and in 1621 went on a travel, the main points of which were Munich, Ingolstadt, Leuven, Bologna and Padua. In addition, they spent a lot of time traveling around the Spanish Netherlands, where they visited military camps, watched the course of the Thirty Years' War, met with Spanish aristocrats and military leaders.

Letters of Lew Sapieha's sons to their father, Lavrenty Kosmovsky, tutor Jan Stanislav, as well as brothers' epistles to each other and some other letters were used to reconstruct their travel. This allowed not only to make a detailed travel itinerary for each of Lew Sapieha's sons, but also allowed to trace the logic and features, disadvantages and advantages of each trip. And besides, it gave an opportunity to learn about the illnesses of Jan Stanislav and Krystof Mikalai, the great difficulties in communication between Western Europe and the Grand Duchy of Lithuania in the first half of the XVII century and ways to solve this issue.

***Keywords:*** educational journey; the House of Sapieha; Lew Sapieha; Jan Stanislav Sapieha; Krystof Mikalai Sapieha; Kasimir Lew Sapieha; European universities; correspondence; early Modern period.

## Уводзіны

У XVI ст. на беларускіх землях паступова распаўсюджвалася традыцыя атрымання еўрапейскай адукацыі. У сярэдзіне XVI ст. да яе далучыліся і шляхецкія роды. Адукацыя шляхты ў Вялікім Княстве Літоўскім складалася з навучання ў хатніх настаўнікаў, калегіумах ці прыхадскіх школах, на двары магната ці караля, аднак выбітныя навукоўцы і аратары выкладалі ў Еўропе. Таму атрымаць якасную, грунтоўную адукацыю прадстаўніку палітычнай эліты было магчымым толькі ў еўрапейскіх універсітэтах. Адукацыйныя падарожжы былі характэрны для ўсіх еўрапейскіх дзяржаў таго перыяду, і ВКЛ не было выключэннем. Да традыцыі еўрапейскай адукацыі далучыліся Сапегі – адзін з найбольш уплывовых родаў ВКЛ, які ў XV ст. з'явіўся на арэне гісторыі, а ў XVI ст. увайшоў у лік магнатэрыі. Актыўнасць прадстаўнікоў роду ў публічным і эканамічным жыцці, значная колькасць пасад дзяржаўных ураднікаў, набыццё маёнткаў, грунтоўная адукацыя дазвалялі Сапегам трывала займаць месца сярод палітычнай эліты.

Мэтай артыкула выступае высвятленне сутнасці і зместу паездак магнатаў ВКЛ ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. на аснове рэканструкцыі адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў роду Сапегаў. Рэалізацыя дадзенай мэты прадугледжвае рашэнне наступных задач: рэканструкцыю працэсаў атрымання адукацыі прадстаўнікамі магнацкага роду Сапегаў; раскрыццё асаблівасцей іх адукацыйных падарожжаў; аналіз уплыву навучання на іх будучую дзейнасць.

Пры падрыхтоўцы артыкула выкарыстоўваліся наратыўны, гісторыка-генетычны і гісторыка-сістэмны метады даследавання. Таксама актыўна выкарыстоўваўся метад гістарычнай рэканструкцыі, які дазволіў аднавіць складнікі адукацыі Льва Сапегі (1557–1633), Яна Станіслава Сапегі (1589–1635), Крыштофа Мікалая Сапегі (1607–1631) і Казіміра Льва Сапегі (1609–1656).

Сучасная гістарычная навука вядзе род Сапегаў ад Сямёна Сапігі (Сапегі), які быў пісарам гаспадарскім пры Казіміры IV Ягелончыку. Яго сыны, Багдан і Іван, заснавалі дзве асноўныя галіны роду: чарэйска-ружанскую і коданскую. У пятым пакаленні нарадзіўся Леў Сапега – знакаміты палітычны дзеяч ВКЛ, які і вывеў сваю сям'ю ў лік самых уплывовых у краіне [1, s. 11].

Род Сапегаў мае багатую гістарыяграфію. І ў XIX, і ў XX ст. былі выдадзены працы, прысвечаныя біяграфіям прадстаўнікоў знакамітага роду[1]. У 1995 г. выйшла праца [2], у якой грунтоўна разглядаюцца паходжанне роду і яго геральдыка, прыводзяцца біяграмы Сапегаў, а таксама спіс пасад, якія яны займалі. Асобны раздзел прысвечаны жанчынам роду, якія пасля замужжа перайшлі ў іншыя сем'і. Вялікую каштоўнасць маюць спіс партрэтаў роду, фотаздымкі і малюнкі рэзідэнцый Сапегаў, а таксама касцёлаў, пабудаваных імі. Другі том працы змяшчае партрэты прадстаўнікоў роду [3].

У XX ст. было напісана больш за 100 манаграфій і артыкулаў па гісторыі роду Сапегаў на польскай, беларускай, літоўскай, украінскай і рускай мовах. У іх даследуюцца асобныя аспекты палітычнай і эканамічнай дзейнасці самых вядомых уплывовых прадстаўнікоў роду, прыводзяцца іх жыццеапісанні. Асабліва шмат прац было прысвечана дзейнасці Льва Сапегі, палітычную біяграфію якога вывучалі гісторыкі розных нацыянальных школ [4–7]. У апошнія дзесяцігоддзі было арганізавана некалькі канферэнцый, прысвечаных Сапегам [1; 8–11]. Грунтоўны агляд напрацаваных матэрыялаў зрабілі польскія даследчыкі Т. Цесельскі і М. Савіцкі ў манаграфіі [1].

Аднак, нягледзячы на вялікі аб'ём даследаванняў, пытанне адукацыі прадстаўнікоў роду грунтоўна вывучана не было. Ёсць некалькі польскіх артыкулаў на гэту тэму [12–17], у якіх разгледжаны некаторыя аспекты адукацыйных падарожжаў Сапегаў. Важна адзначыць, што вывучэнню гэтага пытання дапамагаюць архіўныя крыніцы. Стан архіваў роду Сапегаў апісаў А. Рахуба. Ён адзначыў, што адзінага архіва роду так і не было заснавана [18]. Акрамя таго, старэйшыя дакументы архіва Сапегаў датуюцца канцом XVI ст., перыядам актыўнай публічнай дзейнасці Льва Сапегі, таму інфармацыі пра яго навучанне няшмат. Дакументы, якія сведчаць пра адукацыю сыноў Льва Сапегі, захаваліся. У асноўным гэта лісты, што былі напісаны падчас адукацыйных падарожжаў. Дзякуючы ім ёсць магчымасць прааналізаваць падыход сям'і Льва Сапегі да еўрапейскай адукацыі.

[1]Sapiehowie: materjały historyczno-genealogiczne i majątkowe / red. E. Sapieha. Petersburg : Trenke i Fusnot, 1891. T. 2. 456 s. ; Polski Słownik Biograficzny / red. H. Markiewicz. Wrocław : Zakł. Narod. im. Ossolińskich, 1992–1993. T. 34. 629 s. ; Polski Słownik Biograficzny / red. H. Markiewicz. Kraków : Pol. Akad. Nauk, 1994. T. 35. 640 s.

## Асноўная частка

Трывалая традыцыя падарожжаў у еўрапейскія ўніверсітэты пачалася з Льва Сапегі. Ён нарадзіўся 4 кастрычніка 1557 г. у сям'і падстарасты аршанскага Івана Сапегі і Багданы з роду князёў Друцкіх-Сакалінскіх. Дакладныя звесткі пра дзяцінства Льва Сапегі адсутнічаюць[2]. Вядома, што ў сярэдзіне XVI ст. сям'я не вылучалася ні высокімі пасадамі, ні багаццем. Прадстаўнікі роду шукалі пратэкцыі ў больш магутных і ўплывовых сямей, напрыклад у Радзівілаў. Таму не дзіўна, што Іван Сапега выправіў свайго сямігадовага сына на двор Мікалая Радзівіла Чорнага [6, s. 21]. Да з'яўлення пратэстанцкіх гімназій і каталіцкіх калегіумаў у краіне такі варыянт атрымання ведаў быў распаўсюджаным. Каб вучыцца ў прыватных настаўнікаў разам з дзецьмі магнатаў, на каралеўскім ці магнацкім двары збіралася моладзь. Акрамя таго, шляхецкія дзеці сустракаліся з выбітнымі палітыкамі, навукоўцамі, мастакамі, усталёўвалі карысныя кантакты, рабілі першыя крокі ў публічнай дзейнасці і г. д.

З 1565 г. апека над дзецьмі Мікалая Радзівіла Чорнага перайшла да Мікалая Радзівіла Рудога. У 1570–1571 гг. ён выправіў сваіх пляменнікаў, Юрыя, Альбрэхта і Станіслава, у Лейпцыг, які ў той час быў знакаміты якаснай адукацыяй і артадаксальным пратэстанцкім асяроддзем. У свіце Радзівілаў быў і Леў Сапега. Дакладна невядома, колькі доўжылася яго навучанне, але хутчэй за ўсё ён вярнуўся ў ВКЛ у 1572–1573 гг. разам з маладымі Радзівіламі[3]. Пра знаходжанне Льва Сапегі ў Лейпцыгу дакладных звестак няма. Па здагадках даследчыкаў, Леў Сапега вывучаў там лацінскую мову і еўрапейскае права, але ж навучанне, верагодна, не завяршыў [6, s. 23]. Вярнуўшыся на радзіму, ён пачаў сваю палітычную кар'еру. Кліентам Радзівілаў ён заставаўся да смерці Крыштофа Мікалая Радзівіла Перуна, сына Мікалая Радзівіла Рудога. Пасля Леў Сапега пачаў самастойную дзейнасць і вёў яе так паспяхова, што ўжо пры яго жыцці Сапегі занялі трывалае месца сярод іншых магнацкіх сем'яў ВКЛ.

Такім чынам, адукацыя Льва Сапегі мела два этапы: на першым этапе ён прайшоў навучанне ў ВКЛ, на двары Мікалая Радзівіла Чорнага, на другім – навучанне ў Еўропе. Якраз з сярэдзіны XVI ст. магнаты ВКЛ пачалі здзяйсняць адукацыйныя падарожжы. Галоўнымі мэтамі еўрапейскай адукацыі былі паглыбленне ведаў па асобных навуках, вывучэнне замежных моў, набыццё досведу ў ваеннай справе, усталяванне карысных знаёмстваў.

Навучанне Льва Сапегі немагчыма назваць поўным. На двары Мікалая Радзівіла Чорнага ён правёў каля года, у перыяд з 1565 па 1570 г. Дакладна невядома, ці быў ён разам з маладымі Радзівіламі на двары Мікалая Радзівіла Рудога, ці вярнуўся дадому. У Лейпцыгу ён правёў каля трох гадоў. Звычайна маладыя магнаты і шляхціцы вучыліся ў Еўропе не менш за чатыры гады, паспяваючы за гэты час наведаць некалькі навучальных устаноў. Тым не менш нават такога падарожжа хапіла для таго, каб Леў Сапега зразумеў карысць добрай адукацыі. Таму на навучанне сваіх сыноў, Яна Станіслава, Крыштофа Мікалая і Казіміра Льва, ён не пашкадаваў ні грошай, ні часу.

Рэканструяваць адукацыю маладых Сапегаў магчыма дзякуючы іх лістам да сям'і, лістам іх світы да Льва Сапегі, паведамленням ад іншых асоб. Найбольшая колькасць гэтых лістоў захоўваецца ў Львоўскай нацыянальнай навуковай бібліятэцы імя В. Стэфаніка[4]. Некаторыя лісты знаходзяцца ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Украіны ў Кіеве[5], бібліятэцы Літоўскай акадэміі навук імя Урублеўскіх у Вільнюсе[6], навуковай бібліятэцы Польскай акадэміі мастацтваў і навук і Польскай акадэміі навук у Кракаве[7] і г. д. Польскі даследчык Артур Гашчынскі ў адным са сваіх артыкулаў зрабіў агляд вялікай колькасці лістоў, датычных адукацыі сыноў Льва Сапегі ў Еўропе, што значна спрасціла іх пошук [14, s. 320–324].

Старэйшы сын Льва Сапегі, Ян Станіслаў, пачаў адукацыю ў Віленскай езуіцкай акадэміі прыблізна ў 1599 г. У 1603 г. ён пераехаў у Браўнсберг для навучання ў езуіцкім калегіуме. Там ён знаходзіўся разам са сваім стрыечным братам Крыштофам Стэфанам Сапегам, сынам Рыгора Сапегі [14, s. 153]. Дакументаў гэтага перыяду фактычна не захавалася, аднак праграмы езуіцкіх навучальных устаноў былі падобнымі, таму з упэўненасцю можна казаць, што малады Сапега вывучаў гісторыю, права, палітыку, геаграфію і рыторыку, а таксама лацінскую, нямецкую і, магчыма, старажытнагрэчаскую мовы [16, s. 393].

У канцы 1605 г. маладыя людзі выехалі за межы Рэчы Паспалітай. У ранні Новы час выправіць у адукацыйнае падарожжа родных ці стрыечных братоў аднаго ўзросту было звычайнай з'явай. У такім выпадку патрабавалася менш грошай, было больш бяспечна і маладыя людзі мелі падтрымку адзін аднаго.

У пачатку 1606 г. Ян Станіслаў зрабіў запіс у метрыцы Вюрцбургскага ўніверсітэта, дзе ён знаходзіўся да верасня 1607 г. У той час гэта ўстанова адукацыі была адным з лепшых цэнтраў вывучэння матэматыкі ў Еўропе, дзе на высокім узроўні выкладаліся і гуманітарныя дысцыпліны. Аднак у Вюрцбургу

---

[2]Polski Słownik Biograficzny / red. H. Markiewicz. Kraków : Pol. Akad. Nauk, 1994. T. 35. S. 84.
[3]Ibid.
[4]Львівська національна наукова бібліотека ім. В. Стефаника (ЛННБУ ім. В. Стефаника). Ф. 103.
[5]Центральний державний історичний архів України (ЦДІАК України). Ф. 48.
[6]Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka. F. 139.
[7]Biblioteka Polskiej Akademii Umiejętności i Polskiej Akademii Nauk w Krakowie (BPAUiPANKr). Rkps. 345, 351, 352, 354.

вучылася вельмі мала маладых людзей з ВКЛ і Польшчы [16, s. 396–397]. Менавіта па гэтай прычыне Леў Сапега мог выбраць дадзены ўніверсітэт. Таксама на яго выбар магла паўплываць інструкцыя Давіда Хільхена, сакратара Жыгімонта III і інфлянцкага юрыста[8]. Першая частка інструкцыі з'яўляецца прыблізнай праграмай навучання па еўрапейскаму праву. Другая частка змяшчае розныя аксіёмы і сцверджанні, карысныя для навучання, і мае загаловак «Прыклады аналітычных рашэнняў»[9]. Далей ідзе фактычна асобная кніга з разважаннямі, парадамі і цытатамі Юсцініяна пад назвай «Аб інстытутах або элементах права. Вялікія прынцыпы Юсцініяна». Д. Хільхен адзначаў, што асновай для вывучэння права з'яўляюцца дыялектыка і этыка. Дыялектыка дапамагае «прайсці праз лабірынты законаў», а этыка – зразумець іх вытокі. Наконт юрыдычнай адукацыі дарадца пісаў: «…неабходна шмат слухаць, задаваць пытанні, спрабаваць зразумець і запомніць. Вы павінны штодзень дыскутаваць і спрачацца са сваімі спадарожнікамі па юрыдычных пытаннях, а таксама ўдзельнічаць у публічных дыспутах» [19, s. 239].

З часоў адукацыі ў Вюрцбургу захаваўся ліст Лаўрэнція Касмоўскага, апекуна Яна Станіслава, да Льва Сапегі. Ён датаваны 17 лютага 1607 г. і фактычна не дае сведчанняў пра адукацыю, поспехі і цяжкасці навучання, а засяроджаны на тым, што Ян Станіслаў моцна захварэў. У лісце паведамляецца, што спачатку малады чалавек не вельмі добра адчуў сябе на лекцыях. Хвароба была падобна на звычайную бяскрыўдную застуду, але дайшло да таго, што Ян Станіслаў не мог спаць і есці, часта траціў прытомнасць і ледзь трымаўся на нагах[10]. Л. Касмоўскі пісаў, што распытаў у палякаў, якія жывуць у Вюрцбургу доўгі час, што магло быць прычынай хваробы Яна Станіслава, і прыйшоў да высновы, што гэта забруджанае паветра ў горадзе. Акрамя таго, ён адзначыў, што мясцовая вада ўтрымлівае вялікую колькасць кальцыю. Далей Л. Касмоўскі прапануе змяніць месца навучання, бо курс рымскага права ўжо скончаны, а астатняе можна праслухаць у іншым універсітэце. У гэтым жа лісце апякун разважае наконт таго, што можна зменшыць світу Яна Станіслава і пакінуць у Вюрцбургу вывучаць філасофію, напрыклад, Мікалая Кішку, якому клімат не шкодзіць [16, s. 398].

У лісце ад 23 сакавіка 1607 г. паведамляецца, што Ян Станіслаў ужо добра адчувае сябе і вярнуўся да навучання[11]. У лісце ад 4 чэрвеня 1607 г. Ян Станіслаў піша сваёй мачасе Альжбеце, што скончыў неабходныя курсы ў Вюрцбургу і чакае паведамлення ад бацькі наконт далейшага шляху падарожжа[12].

Прабыўшы ў Вюрцбургу два гады, Ян Станіслаў і Крыштоф Стэфан Сапегі праз Франкфурт-на-Майне паехалі ў Францыю. Парыжскі ўніверсітэт быў папулярны сярод выхадцаў з Рэчы Паспалітай, нягледзячы на тое што жыццё там было зусім не таннае. На папулярнасць установы вельмі ўплывалі французскі каралеўскі двор і знакамітыя парыжскія школы верхавой язды. Акамя таго, Леў Сапега меў вялікую сімпатыю да французскай культуры і мовы, што і магло паўплываць на выбар месца [16, s. 400].

Захавалася некалькі лістоў з Парыжа. У лісце ад 12 мая 1608 г. Л. Касмоўскі піша, што Ян Станіслаў і Крыштоф Стэфан Сапегі кожны дзень слухаюць лекцыі па праву, рыторыцы і займаюцца майстэрствам прамовы[13]. У гэтым жа лісце апякун параўноўвае парыжскіх і вюрцбургскіх настаўнікаў і адзначае, што першыя з'яўляюцца больш дасведчанымі, праводзяць індывідуальныя заняткі і шмат размаўляюць з вучнямі. Адным з настаўнікаў маладых людзей быў прафесар Парыжскага ўніверсітэта Ісаак Казабон (1559–1614), бібліятэкар Генрыха IV. Сапегі нават здымалі пакоі ў яго кватэры[14]. Сяброўства паміж Янам Станіславам і Ісаакам Казабонам працягвалася і пазней. Знакаміты філолаг заахвочваў маладога Сапегу працягваць навуковую дзейнасць[15].

З лістоў Л. Касмоўскага, якія захаваліся, апошні быў напісаны ў Празе 6 снежня 1608 г. З гэтага ліста можна даведацца аб тым, што Леў Сапега выклікаў сына дадому, каб той змог прысутнічаць на сейме ў студзені 1609 г.[16] Вядома, што па дарозе ў ВКЛ малады Сапега затрымаўся ў Лёвене і Нюрымбергу. У апошнім нават нейкі час наведваў лекцыі ва ўніверсітэце[17].

Пасля вяртання дадому Ян Станіслаў трапіў на каралеўскі двор у якасці пакаёвага прыдворнага Жыгімонта III, што таксама магчыма разглядаць як працяг адукацыі. Для Яна Станіслава гэты этап жыцця стаў карысным. Менавіта ў гэты час ён пазнаёміўся з каралевічам Уладзіславам, з якім сябраваў на працягу ўсяго жыцця. У 1611 г. малады чалавек атрымаў пасаду падстоляга вялікага літоўскага, з чаго і пачалася яго палітычная кар'ера [20, s. 165].

У гэтым жа, 1611-м, годзе Ян Станіслаў выехаў у сваё другое адукацыйнае падарожжа, на гэты раз

[8]Biblioteka Jagiellońska w Krakowie. Rkps. 2279.
[9]Тут і далей пераклад наш. – *А. К.*
[10]ЦДІАК України. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 425. Арк. 1 – 1 адв.
[11]Там же. Арк. 3.
[12]BPAUiPANKr. Rkps. 351. K. 125v – 126.
[13]ЦДІАК України. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 425. Арк. 6.
[14]Polski Słownik Biograficzny / red. H. Markiewicz. Kraków : Pol. Akad. Nauk, 1994. T. 35. S. 84.
[15]Ibid.
[16]ЦДІАК України. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 425. Арк. 8.
[17]Archiwum Nacji Polskiej w Uniwersytecie Padewskim / wyd. H. Barycz. Wrocław : Wydaw. Pol. Akad. Nauk, 1971. T. 1 : Metryka Nacji Polskiej w Uniwersytecie Padewskim (1592–1745). S. 376.

у Інгальштат. Але хутка малады Сапега пачаў прасіць дазволу вярнуцца ў ВКЛ з-за пагаршэння здароўя, на яго думку, па прычыне дрэннага паветра[18]. Пасля гэтага Леў Сапега вырашыў завяршыць адукацыю сына, але выправіў яго ў далейшае падарожжа з мэтай набыць знаёмствы і паглядзець свет. Яна Станіслава накіравалі ў Франкфурт-на-Майне на каранацыю новага імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі [16, s. 404]. Затым малады Сапега наведаў Апенінскі паўвостраў. Сведчанні пра яго падарожжа па Італіі захаваліся ў лістах Стэфана Паца, адрасаваных Льву Сапегу. Так, С. Пац пісаў пра тое, што Ян Станіслаў наведваў Венецыю[19], Мілан, Падую, дзе вывучаў італьянскую мову[20]. У Рыме ён пабываў у папы рымскага Паўла V, у Фларэнцыі наведаў род Медычы[21], пабываў у Балонні [16, s. 406]. У ВКЛ Ян Станіслаў Сапега вярнуўся ў жніўні 1613 г.

Такім чынам, адукацыя Яна Станіслава Сапегі складалася з наступных этапаў: навучання ў езуіцкіх школах у Вільні і Брунсбергу, першага падарожжа ў Еўропу для набыцця ведаў, знаходжання пры каралеўскім двары, другога падарожжа для агляду свету, прэзентацыі роду і набыцця знаёмстваў. Другое еўрапейскае падарожжа было больш падобна на папулярныя з сярэдзіны XVII ст. гранд-туры, праграма якіх уключала, акрамя навучання, турыстычныя элементы. Прычынай такога выбітнага падарожжа маглі быць памкненні Льва Сапегі надаць сваёй сям'і як мага большую вагу, чаму дапамагалі бліскучая адукацыя сыноў і іх аўдыенцыі ў самых уплывовых асоб Еўропы. Пазней прысутнасць на каранацыях, аўдыенцыі ў каралеўскіх асоб і наведванне Ватыкана сталі часткай гранд-тураў прадстаўнікоў самых заможных і ўплывовых родаў ВКЛ.

Дакументаў, якія сведчаць пра адукацыйныя падарожжы малодшых сыноў Льва Сапегі, захавалася значна больш, таму этапы іх навучання магчыма рэканструяваць больш дакладна. Яны пісалі лісты не толькі бацьку, але і старэйшаму брату, у якога час ад часу прасілі дапамогі ў вырашэнні розных непаразуменняў з бацькам ці дзяліліся навінамі. Таксама захаваліся лісты Льва Сапегі, адрасаваныя старэйшаму сыну, дзе ўзнімаліся пытанні наконт падарожжа яго братоў.

Крыштоф Мікалай Сапега першапачаткова атрымаў хатнюю адукацыю, а пасля вучыўся ў Віленскай езуіцкай акадэміі[22]. Казімір Леў правёў дзяцінства на двары свайго дзядзькі Крыштофа Радзівіла Перуна і пры каралеўскім двары ў Вільні[23], пасля вучыўся ў Віленскай езуіцкай акадэміі. У 1621 г. браты выехалі за межы ВКЛ пад апекай Каспра Гетнера [12, s. 44].

Месцам навучання маладых Сапегаў быў абраны езуіцкі калегіум у Мюнхене[24]. Відаць, вопыт падарожжа старэйшага сына і ліст ад Л. Касмоўскага наконт хваробы Яна Станіслава мелі вынікі і малодшыя сыны паехалі ў папулярны Мюнхен. Дарога не была простай, з-за пытанняў бяспекі браты на некалькі дзён засталіся ў Лейпцыгу. Гэта былі часы Трыццацігадовай вайны, таму ў рэгіёне актывізаваліся бандыты [21, s. 92–93]. Найбольш бяспечна было ісці вялікай узброенай групай, што і вырашылі зрабіць браты. У лісце ад 18 лістапада 1621 г. яны паведамілі бацьку пра сітуацыю і рашэнне шукаць кампаньёнаў для далейшага падарожжа[25]. Наступны ліст быў напісаны 10 снежня 1621 г. з Нюрнберга[26]. З яго можна даведацца аб тым, што браты Сапегі адхіліліся ад маршруту і наведалі Кобург, дзе гасцілі ў герцага Ёгана Казіміра Саксен-Кобурга (1564–1633). Далейшы шлях ішоў праз Аўгсбург, адкуль у канцы 1621 г. браты накіраваліся ў Мюнхен[27]. У лісце яны распавядалі пра свае бліжэйшыя планы па навучанні: Крыштоф Мікалай засяродзіўся на паэтыцы і гісторыі, каб потым перайсці да рыторыкі, а Казімір Леў вырашыў удасканаліць валоданне лацінскай мовай[28]. У Мюнхене браты вучыліся па традыцыйнай схеме: спачатку атрымалі агульныя гуманітарныя веды шляхам вывучэння базавых рэлігійных і філасофскіх твораў (Цыцэрона, Платона, Арыстоцеля, Гермагена Тарскага і інш.), а потым прайшлі курс рыторыкі, дзе вучыліся мастацтву прамовы. Таксама маладыя Сапегі бралі прыватныя заняткі па лацінскай і нямецкай мовах[29]. Акрамя гэтага, яны вялі актыўнае сацыяльнае жыццё, удзельнічалі ў святкаваннях і сяброўскіх сустрэчах, мелі добрыя зносіны з курфюрстамі Баварыі Вільгельмам V Набожным (1548–1626) і Максімілянам I (1573–1651)[30].

У адрозненне ад далейшых падарожжаў лістоў з Мюнхена няшмат. Прычын магло быць некалькі, напрыклад напружаная ваенная сітуацыя і цяжкасці перамяшчэння пасыльных па Еўропе. Так, у адным з лістоў за 1625 г. Крыштоф Мікалай і Казімір Леў пісалі, што з-за вайны немагчыма адпраўляць лісты

[18] Biblioteka Narodowa w Warszawie. Biblioteka Ordynacji Zamojskiej. Rkps. 942. K. 44.
[19] ЦДІАК України. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 516. Арк. 1.
[20] Там же. Спр. 510. Арк. 1 – 1 адв.
[21] Там же. Спр. 517. Арк. 1.
[22] Polski Słownik Biograficzny / red. H. Markiewicz. Kraków : Pol. Akad. Nauk, 1994. T. 35. S. 70.
[23] Ibid. S. 31.
[24] Ibid. S. 31, 70.
[25] ЛННБУ ім. В. Стефаника. Ф. 103. Оп. 6. Тека 557. № 346.
[26] Там же. № 353.
[27] Там же. № 360.
[28] Там же.
[29] Polski Słownik Biograficzny… T. 35. S. 31, 70.
[30] Sapiehowie: materjały… T. 2. S. 12.

праз Нідэрланды і трэба везці іх праз нямецкія землі[31]. Акрамя таго, перыядычна да Льва Сапегі высылаліся людзі, якія маглі падрабязна распавесці пра адукацыю і жыццё сыноў [14, s. 305].

У 1624 г. браты пераехалі ў Інгальштат, дзе 17 студзеня былі іматрыкуляваны [14, s. 302]. Праз некалькі месяцаў Крыштоф Мікалай захварэў. Даследчыкі лічаць, што гэта былі сухоты. Браты выехалі на лячэнне ў Аўгсбург, дзе дактары былі больш дасведчанымі, чым у Інгальштаце[32], але гэта не дапамагло. Было вырашана змяніць клімат. Спачатку разглядаўся варыянт Італіі, але потым браты далучыліся да вялікай групы купцоў і накіраваліся дадому. Бацьку пра хваробу і сваё вяртанне яны паведамілі, знаходзячыся ўжо ў Брэсце[33]. Такое рашэнне яны аргументавалі тым, што хацелі трапіць дадому да зімы і не было часу чакаць адказу.

Крыштофу Мікалаю хутка палепшала, і ў сакавіку 1625 г. Леў Сапега зноў выправіў сыноў у Еўропу. Праз Вроцлаў[34], Франкфурт-на-Майне, Кёльн[35], Аахен браты даехалі да Лёвена[36]. У Лёвене яны вывучалі палітыку, гісторыю, этыку, філасофію, рыторыку. Іх настаўнікамі былі знакамітыя прафесары-гуманісты Эрыцыус Пуцеанус (1574–1646), Мікалай Венулеус (1583–1649), Пётр Касцелянус (1582–1632). Так, пад кіраўніцтвам Э. Пуцеануса Крыштоф Мікалай напісаў працу, прысвечаную Дзмітрыю Самазванцу[37], а пасля вяртання ў ВКЛ працягнуў тлумачэнне прац Ціта Лівія, якое не скончыў па прычыне смерці ў 1631 г. [22, s. 215]. Акрамя таго, прафесар захаваў кантакт з Сапегамі і пасля іх ад'езду [22, s. 215]. Так, у 1636 г. Казімір Леў прымаў сына Э. Пуцеануса – Юста[38].

Падчас навучання ў Лёвене браты некалькі разоў здзяйснялі падарожжы да нідэрландскіх і іспанскіх ваенных абозаў з мэтай азнаямлення з ваеннымі навукамі. У 1625 г. падчас вакацый яны наведалі абоз Амбрэзіа Спінолі (1569–1630), назіралі за ўзяццем Брэды іспанцамі ў чэрвені 1625 г. [12, s. 46]. Падчас вакацый браты сустрэліся з намесніцай Іспанскіх Нідэрландаў Ізабелай Аўстрыйскай (1566–1633) і іншымі еўрапейскімі арыстакратамі[39].

У сярэдзіне 1627 г. навучанне братоў скончылася. Так, 22 чэрвеня прайшлі выніковыя дэбаты Крыштофа Мікалая па тэме «Палітычныя тэзісы з кніг Арыстоцеля аб дзяржаве», і ў ліпені браты на нейкі час раздзяліліся[40]. Захаваліся два лісты ад 13 ліпеня 1627 г. Крыштоф Мікалай з Бруселя і Казімір Леў з Лёвена пісалі пра тое, што Крыштоф скончыў навучанне і паехаў у Брусель, а яго брат застаўся, каб завяршыць курс палітыкі[41]. У Бруселі Крыштоф Мікалай у прыватных настаўнікаў навучаўся верхавой яздзе, фехтаванню, ваеннай інжынерыі і мовам. Ліст ад 1 жніўня 1627 г. з Лёвена браты пішуць ужо разам. Яны паведамляюць, што збіраюцца ехаць да іспанскага ваеннага абозу Хендрыка ван дэн Берга (1573–1638)[42].

Пра далейшы маршрут братоў вядома тое, што ў верасні – кастрычніку 1627 г. яны былі ў Антверпене[43], у пачатку 1628 г. – у Бруселі[44]. У лісце з Бруселя браты распавядаюць пра свае планы наконт падарожжа ў Італію праз Францыю. У Францыі нейкі час яны правялі ў ваенных абозах[45].

Браты былі іматрыкуляваны ў Балонні ў 1628 г., а ў Падуі ў 1629 г. [14, s. 297]. З гэтага перыяду захаваўся ліст ад 15 студзеня 1629 г., напісаны з Пармы, у якім браты інфармавалі Яна Станіслава Сапегу пра тое, што Крыштоф Мікалай вяртаецца ў ВКЛ з-за абвастрэння хваробы[46]. Пасля ад'езду Крыштофа Мікалая малодшы Сапега застаўся на некалькі месяцаў у Італіі і паспеў наведаць Фларэнцыю[47]. У лісце ад 31 сакавіка 1629 г. ён паведамляў аб жаданні пабываць у Рыме і Неапалі[48]. У апошнія дні кастрычніка Казімір Леў піша ўжо з тэрыторыі Рэчы Паспалітай[49].

Лісты маладых Сапегаў, іх апекуноў і іншых падарожнікаў сведчаць пра тое, што сям'я вельмі сур'ёзна ставілася да адукацыі. Маладыя Сапегі даволі падрабязна апісвалі ўвесь працэс навучання. Тэмай ліставання былі і пытанні здароўя: маладыя людзі не толькі паведамлялі пра свае хваробы, але і пыталіся пра самаадчуванне блізкіх. Асобнае месца займае тэма здароўя Яна Станіслава, які з сярэдзіны 1620-х гг. змагаўся з псіхічнай хваробай [13, s. 68]. Таксама

[31]ЛННБУ ім. В. Стефаника. Ф. 103. Оп. 6. Тека 155. № 263.
[32]Там же. № 150.
[33]Там же.
[34]Там же. № 174.
[35]Там же. № 189.
[36]Там же. № 191.
[37]Polski Słownik Biograficzny / red. H. Markiewicz. Kraków : Pol. Akad. Nauk, 1994. T. 35. S. 31, 70.
[38]Ibid. S. 31.
[39]Ibid.
[40]Ibid. S. 70–71.
[41]ЛННБУ ім. В. Стефаника. Ф. 103. Оп. 6. Тека 157. № 43.
[42]Там же. № 54.
[43]Там же. № 85 ; Там же. № 88.
[44]Там же. № 128.
[45]Polski Słownik Biograficzny… T. 35. S. 70–71.
[46]ЛННБУ ім. В. Стефаника. Ф. 103. Оп. 6. Тека 157. № 274.
[47]Там же. № 298.
[48]Там же. № 309.
[49]Там же. № 383.

ў лістах абмяркоўваліся перашкоды ў камунікацыі [15, s. 215]. З гэтай тэмай было звязана вялікае незадавальненне Льва Сапегі, які вінаваціў сыноў у недысцыплінаванасці. Крыштоф Мікалай і Казімір Леў наракалі на тое, што лісты губляюцца. Па гэтай прычыне некаторыя важныя рашэнні маладым магнатам і іх свіце трэба было прымаць самастойна, як было з вяртаннем дадому ў 1624 г. з-за хваробы Крыштофа Мікалая. Акрамя таго, у лістах маладыя Сапегі паведамлялі важныя навіны Трыццацігадовай вайны (звесткі з франтоў, расклад сіл і г. д.). Падчас падарожжа па Італіі ў малодшых сыноў Льва Сапегі ўзніклі фінансавыя цяжкасці. У лісце ад 24 кастрычніка 1628 г. Леў Сапега прасіў свайго старэйшага сына, Яна Станіслава, напісаць братам, каб тыя вярталіся дадому, бо не хапала грошай працягваць падарожжа[50]. Сродкі ў той момант ішлі не толькі на адукацыю маладых Сапегаў (улічваючы, што падарожжа Крыштофа Мікалая і Казіміра Льва цягнулася з 1621 г., выдаткаваная сума, пэўна, была велізарнай), але і на вайну са Швецыяй (1626–1629) [13, s. 71]. Праз лісты можна дазнацца пра асаблівасці навучання ў навучальных установах, паўсядзённае жыццё маладых людзей у розных гарадах. Добрым прыкладам з'яўляецца даследаванне Л. Касмоўскага пра паветра Вюрцбурга. Аднак у лістах практычна няма звестак пра самі гарады.

## Заключэнне

Такім чынам, Леў Сапега і тры яго сыны навучаліся ў еўрапейскіх універсітэтах у 1570–1630 гг. У сваё адукацыйнае падарожжа Леў Сапега адправіўся ў Лейпцыг. Ян Станіслаў Сапега атрымліваў адукацыю ў Віленскай езуіцкай акадэміі, Браўнсбергскім калегіуме, ён наведаў Вюрцбург, Парыж, Інгальштат, а таксама вядомыя гарады Італіі. Крыштоф Мікалай і Казімір Леў Сапегі навучаліся ў Віленскай езуіцкай акадэміі, наведалі Мюнхен, Інгальштат, Лёвен, Балонню.

Выбар накірунку кожнага з падарожжаў меў пэўную логіку. Леў Сапега навучаўся ў адным з самых папулярных універсітэтаў Рэчы Паспалітай. Польскае зямляцтва ў Лейпцыгу існавала з моманту адкрыцця ўніверсітэта, там была моцная гуманітарная школа. На падарожжа маладых Сапегаў паўплывалі сімпатыі бацькі. Напрыклад, Інгальштат і Мюнхен з'яўляліся цэнтрамі контррэфармацыйнага руху, а паміж Італіяй і каталіцкімі магнацкімі сем'ямі заўсёды былі моцныя сувязі, што дэманструе жаданне Льва Сапегі вывесці свой род у лік найбольш уплывовых у дзяржаве. Парыж быў знакаміты не толькі сваімі выкладчыкамі, але і каралеўскім дваром, рыцарскімі школамі. Выбар Вюрцбургскага ўніверсітэта зроблены пад уплывам хутчэй за ўсё парад Д. Хільхена. Выбар Лёвена для падарожжа малодшых сыноў вельмі прадказальны: там быў высокі ўзровень адукацыі, ішла Трыццацігадовая вайна і ваенна-палітычная сітуацыя была зменлівая, а Лёвен знаходзіўся блізка да асноўных цэнтраў падзей гэтай вайны.

Безумоўна, шматгадовая адукацыя ў лепшых навуковых цэнтрах Еўропы паўплывала на станаўленне Сапегаў. Так, не выклікае сумневаў тое, што гады навучання Льва Сапегі ў Лейпцыгскім універсітэце дазволілі яму азнаёміцца з лацінамоўнай літаратурай і атрымаць веды па базавых гуманітарных дысцыплінах. Дзякуючы дзейнасці Льва Сапегі на найбольш уплывовых пасадах атрыманыя ім веды і ідэі адыгралі значную ролю ў развіцці і ўмацаванні прагрэсіўнай, свецкай сацыяльна-палітычнай думкі і рэлігійнай талерантнасці ў ВКЛ у другой палове XVI ст.

Грунтоўная шматгадовая адукацыя маладых Сапегаў таксама павінна была мець вялікі ўплыў на іх дзейнасць. Аднак Ян Станіслаў з 1620-х гг. пакутаваў ад псіхічнай хваробы, якая не дазволіла яму прымаць актыўны ўдзел у палітычным, эканамічным і культурным жыцці ВКЛ. Не менш трагічным быў лёс яго малодшага брата, Крыштофа Мікалая, які меў вялікую схільнасць да навук, займаўся гістарычнай і літаратурнай дзейнасцю, аднак у 23 гады памёр ад сухотаў. А вось малодшы сын Льва Сапегі, Казімір Леў, стаў вядомым паліглотам, вёў актыўную палітычную дзейнасць, прымаў удзел у вайне з казакамі у 1648–1653 гг., падчас вайны 1654–1667 гг. выставіў уласны полк. Найбольшы ўплыў ён аказаў на культурнае жыццё ВКЛ: заснаваў у Віленскай езуіцкай акадэміі фонд, які дазволіў аплачваць працу чатырох прафесараў, перадаў установе вялікую бібліятэку, фундаваў некалькі касцёлаў і кляштараў, сярод якіх быў картускі кляштар у Бярозе, і г. д.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Ciesielski T, Sawicki M. Sapiehowie – historia i dziedzictwo rodu. In: Ciesielski T, redaktor. *Wielkie rody dawnej Rzeczypospolitej XVI–XIX wieku. Tom 1, Sapiehowie.* Opole: Wydawnictwo Uniwersytetu Opolskiego; 2018. 446 s.
2. Sapieha E. *Dom Sapieżyński. Tom 1.* Warszawa: PWN; 1995. 804 s.
3. Sapieha E. Kałamajska-Saeed M. *Dom Sapieżyński. Ikonografia. Tom 2.* Warszawa: PWN; 2008. 447 s.
4. Саверчанка І. *Канцлер Вялікага княства: Леў Сапега*. Мінск: Навука і тэхніка; 1992. 63 с.
5. Lazutka S. *Leonas sapiega: gyvenimas, valstybinė veikla, politinės ir filosofinės pažiūros*. Vilnius: Margi Raštai; 1998. 176 p.
6. Czwołek A. *Piórem i buławą. Działalność polityczna Lwa Sapiehy, kanclerza litewskiego, wojewody wileńskiego*. Toruń: Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika; 2012. 734 s.

[50]ЛННБУ ім. В. Стефаника. Ф. 103. Оп. 6. Тека 157. № 202.

7. Шкелёнак М. *У трохсотыя ўгодкі смерці вялікага канцлера Льва Сапегі*. Вільня: Друкарня Я. Левіна; 1933. 30 с.
8. Марозава СВ, рэдактар. *Леў Сапега (1557–1633 гг.) і яго час*. Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы; 2007. 422 с.
9. Stępnik K, redaktor. *Sapiehowie epoki Kodnia i Krasiczyna*. Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej; 2007. 661 s.
10. Праневіч ГМ, рэдактар. *Вялікі канцлер Вялікага княства (да 450-годдзя з дня нараджэння Льва Сапегі)*. Мінск: Логвінаў; 2007. 168 с.
11. Скеп'ян АА, складальнік; Каваленя АА, рэдактар. *Сапегі: асобы, кар'еры, маёнткі*. Мінск: А. М. Янушкевіч; 2018. 320 с.
12. Ziober A. Korespondencja Kazimierza Leona i Mikołaja Krzysztofa Sapiehów z podróży w latach 1625–1627. Wybrane aspekty. W: Chorążyczewski W, Pacevičius A, Roszak S, redaktorzy. *Egodokumenty: tradycje historiograficzne i perspektywy badawcze*. Toruń: Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika; 2015. s. 43–56.
13. Ziober A. Korespondencja rodzinna Sapiehów z czasów wyjazdów zagranicznych Jana Stanisława, Kazimierza Leona i Krzysztofa Mikołaja w latach 1627–1630. Wybrane zagadnienia. W: Borka P, Olmy M, redaktorzy. *Epistolografia w dawnej Rzeczypospolitej*. *Volume 6*. Kraków: Collegium Columbinum; 2015. s. 67–80.
14. Goszczyński A. Korespondencja jako żródło do badań nad podróżami edukacyjnymi synów Lwa Sapiehy. W: Żołądź-Strzelczyk D, Kowalczyk ME, redaktory. *Źródła do dziejów staropolskich podróży edukacyjnych*. Wrocław: Wydawnictwo Chronicon; 2017. s. 295–326.
15. Ziober A. Relacje Lwa Sapiehy z synami w latach 20. XVII wieku w świetle wybranej korespondencji. Zarys problematyki. W: Borka P, Olmy M, redaktorzy. *Epistolografia w dawnej Rzeczypospolitej. Volume 7.* Kraków: Collegium Columbinum; 2017. s. 211–224.
16. Goszczyński A. Podróże edukacyjne Jana Stanisława Sapiehy (1589–1635). W: Ciesielski T, redaktor. *Wielkie rody dawnej Rzeczypospolitej XVI–XIX wieku. Tom 1, Sapiehowie*. Opole: Wydawnictwo Uniwersytetu Opolskiego; 2018. s. 391–410.
17. Ziober A. Podróże edukacyjne Sapiehów w pierwszej połowie XVII w. Przyczynek do badań. W: Perłakowski A, Wolański F, Rok B, redaktorzy. *Sapientia ars vivendi putanda est. Wokół kultury i polityki. Studia z dziejów nowożytnych ofiarowane profesorowi Marianowi Chachajowi*. Kraków: Księgarnia Akademicka; 2019. s. 145–162.
18. Rachuba A. Archiwa Sapiehów – ich losy, stan obecny. *Miscellanea Historiko-Archivistica*. 1998;9:101–108.
19. Żołądź-Strzelczyk D. *O przedsięwzięciu peregrynacyjej: edukacyjne wojaże szlachty z Rzeczypospolitej w świetle instrukcji podróżnych*. Warszawa: Muzeum Pałacu Króla Jana III w Wilanowie; 2020. 435 s.
20. Lulewicz H, Rachuba A, kompilatory. *Urzędnicy centralni i dostojnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku*. Kórnik: Biblioteka Kórnicka; 1994. 255 s.
21. Mączak A. *Odkrywanie Europy: podróże w czasach renesansu i baroku*. Gdańsk: Novus Orbis; 1998. 275 s.
22. Kot S. Stosunki Polaków z Uniwersytetem Lowańskim: w 500 rocznicę otwarcia Uniwersytetu w Lowanium. W: Łempicki S, redaktor. *Minerwa Polska*. Lwów: Wydawnictwo Zakładu Narodowego im. Ossolińskich; 1927. s. 199–224.

## References

1. Ciesielski T, Sawicki M. Sapiehowie – historia i dziedzictwo rodu. In: Ciesielski T, redaktor. *Wielkie rody dawnej Rzeczypospolitej XVI–XIX wieku. Tom 1, Sapiehowie*. Opole: Wydawnictwo Uniwersytetu Opolskiego; 2018. 446 s.
2. Sapieha E. *Dom Sapieżyński*. *Tom 1*. Warszawa: PWN; 1995. 804 s.
3. Sapieha E. Kałamajska-Saeed M. *Dom Sapieżyński. Ikonografia. Tom 2*. Warszawa: PWN; 2008. 447 s.
4. Saverchanka I. *Kancler Vjalikaga knjastva: Lew Sapega* [Chancellor of the Grand Duchy: Lew Sapieha]. Minsk: Navuka i tjehnika; 1992. 63 p. Belarusian.
5. Lazutka S. *Leonas sapiega: gyvenimas, valstybinė veikla, politinės ir filosofinės pažiūros*. Vilnius: Margi Raštai; 1998. 176 p.
6. Czwołek A. *Piórem i buławą. Działalność polityczna Lwa Sapiehy, kanclerza litewskiego, wojewody wileńskiego*. Toruń: Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika; 2012. 734 s.
7. Shkeljonak M. *U trohsotyja wgodki smerci vjalikaga kanclera L'va Sapegi* [On the 300$^{th}$ anniversary of the death of the great chancellor Lwa Sapiehi]. Vil'nja: Drukarnja Ja. Levina; 1933. 30 p. Belarusian.
8. Marozava SV, editor. *Lew Sapega (1557–1633 gg.) i jago chas* [Lew Sapieha (1557–1633) and his time]. Grodno: Yanka Kupala State University of Grodno; 2007. 422 p. Belarusian.
9. Stępnik K, redaktor. *Sapiehowie epoki Kodnia i Krasiczyna*. Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej; 2007. 661 s.
10. Pranevich GM, editor. *Vjaliki kancler Vjalikaga knjastva (da 450-goddzja z dnja naradzhjennja L'va Sapegi)* [Grand Chancellor of the Grand Duchy (until the 450$^{th}$ anniversary of the birth of Lew Sapieha)]. Minsk: Logvinaw; 2007. 168 p. Belarusian.
11. Skep'jan AA, compiler; Kavalenja AA, editor. *Sapegi: asoby, kar'ery, majontki* [Sapiehi: individuals, careers, estates]. Minsk: A. M. Janushkevich; 2018. 320 p. Belarusian.
12. Ziober A. Korespondencja Kazimierza Leona i Mikołaja Krzysztofa Sapiehów z podróży w latach 1625–1627. Wybrane aspekty. W: Chorążyczewski W, Pacevičius A, Roszak S, redaktorzy. *Egodokumenty: tradycje historiograficzne i perspektywy badawcze*. Toruń: Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika; 2015. s. 43–56.
13. Ziober A. Korespondencja rodzinna Sapiehów z czasów wyjazdów zagranicznych Jana Stanisława, Kazimierza Leona i Krzysztofa Mikołaja w latach 1627–1630. Wybrane zagadnienia. W: Borka P, Olmy M, redaktorzy. *Epistolografia w dawnej Rzeczypospolitej*. *Volume 6*. Kraków: Collegium Columbinum; 2015. s. 67–80.
14. Goszczyński A. Korespondencja jako żródło do badań nad podróżami edukacyjnymi synów Lwa Sapiehy. W: Żołądź-Strzelczyk D, Kowalczyk ME, redaktorzy. *Źródła do dziejów staropolskich podróży edukacyjnych*. Wrocław: Wydawnictwo Chronicon; 2017. s. 295–326.
15. Ziober A. Relacje Lwa Sapiehy z synami w latach 20. XVII wieku w świetle wybranej korespondencji. Zarys problematyki. W: Borka P, Olmy M, redaktorzy. *Epistolografia w dawnej Rzeczypospolitej. Volume 7.* Kraków: Collegium Columbinum; 2017. s. 211–224.

16. Goszczyński A. Podróże edukacyjne Jana Stanisława Sapiehy (1589–1635). W: Ciesielski T, redaktor. *Wielkie rody dawnej Rzeczypospolitej XVI–XIX wieku. Tom 1, Sapiehowie*. Opole: Wydawnictwo Uniwersytetu Opolskiego; 2018. s. 391–410.

17. Ziober A. Podróże edukacyjne Sapiehów w pierwszej połowie XVII w. Przyczynek do badań. W: Perłakowski A, Wolański F, Rok B, redaktorzy. *Sapientia ars vivendi putanda est. Wokół kultury i polityki. Studia z dziejów nowożytnych ofiarowane profesorowi Marianowi Chachajowi.* Kraków: Księgarnia Akademicka; 2019. s. 145–162.

18. Rachuba A. Archiwa Sapiehów – ich losy, stan obecny. *Miscellanea Historiko-Archivistica*. 1998;9:101–108.

19. Żołądź-Strzelczyk D. *O przedsięwzięciu peregrynacyjej: edukacyjne wojaże szlachty z Rzeczypospolitej w świetle instrukcji podróżnych*. Warszawa: Muzeum Pałacu Króla Jana III w Wilanowie; 2020. 435 s.

20. Lulewicz H, Rachuba A, kompilatory. *Urzędnicy centralni i dostojnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku*. Kórnik: Biblioteka Kórnicka; 1994. 255 s.

21. Mączak A. *Odkrywanie Europy: podróże w czasach renesansu i baroku*. Gdańsk: Novus Orbis; 1998. 275 s.

22. Kot S. Stosunki Polaków z Uniwersytetem Lowańskim: w 500 rocznicę otwarcia Uniwersytetu w Lowanium. W: Łempicki S, redaktor. *Minerwa Polska*. Lwów: Wydawnictwo Zakładu Narodowego im. Ossolińskich; 1927. s. 199–224.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 08.11.2022.*
*Received by editorial board 08.11.2022.*